Источник: “Рэспубліка” – 2019-12-10

# Сон у зімовую ноч



Не бачыце сусліка? А ён ёсць! Гэтая прывабная стэпавая жывёлка магла б стаць візітнай карткай некалькіх раёнаў Мінскай вобласці і прыцягнуць да сябе ўвагу шматлікіх турыстаў. Але атрымалася так, што, не паспеўшы як мае быць рассяліцца па краіне, рабы суслік атрымлівае ад чалавека новыя ўдары. Падрабязнасці высвятляла карэспандэнт «Р».

Яшчэ ў 2018 годзе навукоўцы не ведалі ніводнага месцапражывання гэтай забаўнай жывёлы на тэрыторыі краіны, але сёння дакладна вядома, што рабыя суслікі аблюбавалі Нясвіжскі, Стаўбцоўскі, Капыльскі і Баранавіцкі раёны Міншчыны.

## Лепш не турбаваць

Некалі гэты грызун быў у нас звычайным відам і спакойна жыў у Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцях. Па некаторых звестках, гэты звярок сяліўся і на ўсходзе Гомельшчыны. Сёння рабы суслік трапіў ў Чырвоную кнігу Беларусі, яго існаваннем у прыродзе ўсур’ёз заклапочаны эколагі.

Пётр Сачак, каардынатар ініцыятыў праекта ПРААН «Экаманіторынг», заўважыў цікавы факт:

— Яшчэ ў 2018 годзе навукоўцы не ведалі ніводнага месцапражывання гэтай забаўнай жывёлы на тэрыторыі краіны, але сёння дакладна вядома, што рабыя суслікі аблюбавалі Нясвіжскі, Стаўбцоўскі, Капыльскі і Баранавіцкі раёны Міншчыны. Менавіта тут знойдзены рэшткі іх папуляцыі — дзякуючы новай экалагічнай ініцыятыве пад назвай «Хамяк, суслік і вавёрка-палятуха: выратаваць супергрызуноў!».

Вядома, што даўжыня цела жвавага стэпавага жыхара каля 20—25 сантыметраў, хваста — да 6 сантыметраў. Вага яго дасягае 300 грамаў. Селяцца суслікі звычайна калоніямі на сухіх участках з невысокай лугавой расліннасцю. Звяркі жывуць на старых вытаптаных пашах, дзе кормяцца травой. На збожжавае поле яны заходзяць толькі паласавацца абсыпаным збожжам, але істотнай шкоды палядам не наносяць.

Голас сусліка гучны і меладычны, нагадвае свіст. Гэтыя жывёлкі найбольш актыўныя раніцай і надвячоркам. Узімку ўпадаюць у спячку, якая доўжыцца з паўгода: з верасня-кастрычніка па сакавік-красавік. Суслік большую частку жыцця праводзіць у нары дыяметрам 5—7 сантыметраў. У пачатку чэрвеня ў кожнай самкі нараджаюцца ад 2 да 8 дзетак, радзей — да 10. Век жывёлкі караткаваты, каля чатырох гадоў.

## Пад пагрозай

У сімпатычнага сусліка, на жаль, лёс небаракі, бо яго актыўна вынішчалі ў 1950—60-я гады як «абжору і шкодніка», які сваімі норкамі перашкаджаў спаборніцтвам калгасаў за ўраджай. Забіваць суслікаў заклікалі са старонак савецкіх газет нават школьнікаў.

Але з жывёлай, якая вымірае, людзі абыходзяцца жорстка і сёння — нядаўна ў Капыльскім раёне спецыялісты адной аграгаспадаркі проста завалілі паселішча суслікаў навозам. Арганіку там возяць з мясцовай фермы, каб затым угнойваць ёй размешчаныя побач палі гаспадаркі. Атрымалася так, што яе выгрузілі на краі калоніі. Эколагі заклапочаны: пасля зімовай спячкі жывёлы могуць не выйсці з норак ці выйсці крыху раней — з-за перагнойнай вільгаці — і загінуць на паверхні ад пераахалоджання.

— Яшчэ ў верасні мы пісьмова папярэдзілі землекарыстальніка і раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя аб пасяленні тут суслікаў і аб тым, што гаспадарка павінна прымаць меры для захавання месцапражывання віду. Вясной, калі суслікі выйдуць з нор, можна будзе скласці акт аб загінулых звярках і падлічыць нанесеную прыродзе шкоду. Землекарыстальніку давядзецца панесці адказнасць за кожнага звярка, які загінуў па яго віне, а гэта пагражае немалым штрафам. Згодна з указам Прэзідэнта мінімальны памер штрафа за незаконнае знішчэнне адной асобіны занесенай у Чырвоную кнігу жывёлы складае 9 базавых велічынь, — расказаў эксперт «Аховы птушак Бацькаўшчыны» Сяргей Шакала.

## Выратаваць жыццё віду

Аляксандр Вінчэўскі, дырэктар аб’яднання АПБ, падкрэслівае, што рабы суслік занесены і ў Міжнародную Чырвоную кнігу, мае міжнародны статус аб’екта аховы і ўключаны ў Дадатак II «Віды фаўны, якія падлягаюць строгай ахове» Бернскай канвенцыі аб ахове дзікай фаўны і флоры і прыроднага асяроддзя пражывання ў Еўропе. Магчыма, гэты статус дапаможа маленькім грызунам распаўсюдзіцца па краіне.

Дарэчы, нядаўна эксперты выявілі ў Нясвіжскім раёне вялізную калонію — каля тысячы асобін, адну з найбуйнейшых у Еўропе. Сяргей Шакала ўпэўнены, што знаходка — сапраўдны нацыянальны здабытак, які мае сэнс з пункта гледжання развіцця экатурыстычнага патэнцыялу краіны:

— Людзі выжывалі звяркоў са спрадвечных месцаў калоній, а сёння мы павінны захаваць іх на гэтым прыродным астраўку. Калі не прыняць комплекс мер зараз, мы можам страціць суслікаў назаўсёды. Для іх аховы недастаткова толькі аформіць пашпарты і адпаведныя абавязацельствы, трэба рэгулярна наведваць тэрыторыі і глядзець, што там робіцца. Патрэбна прапаганда на месцах, дзе ёсць суслікі, пастаянныя выезды і маніторынг — тады гэта будзе рэальная дапамога.

У навукова-практычным цэнтры НАН Беларусі па біярэсурсах таксама лічаць: тое, што суслікі захаваліся ў нас дагэтуль, — вельмі добрая вестка. Але без захавання традыцыйнага спосабу карыстання ўгоддзямі іх калонія можа знікнуць канчаткова. Асабліва небяспечна, калі ўгоддзі становяцца даступнымі позняй восенню або ранняй вясной: звяркі знаходзяцца ў спячцы і не могуць нікуды перамясціцца, адзначаюць у НАН. Але можа здарыцца і так, што з-за адсутнасці касьбы і выпасу буйной або дробнай рагатай жывёлы лугі, дзе жывуць суслікі, зарастуць. Тады суслікі знікнуць. Гэтыя стэпавыя грызуны не любяць павышаную вільготнасць і густы травастой.

Аляксандр Вінчэўскі рэзюмуе:

— Калі ўпершыню ўбачыў жывога сусліка гэтым летам, быў захоплены тым, наколькі ён артыстычны — як знакаміты сурыкат Цімон з вядомага мультфільма пра Караля Льва. Адразу падумаў, што беларускія суслікі маглі б стаць турыстычным брэндам. Госці Беларусі з задавальненнем пазнаёміліся б з гэтым прывабным, але малавядомым грызуном, купілі б сувеніры з яго выявай. Праца з турыстамі магла б стаць дадатковым заробкам для мясцовых жыхароў. Хто ведае, магчыма, суслікі, якія яшчэ нядаўна ўсім нам так замінали, хутка пасадзейнічаюць стварэнню новых працоўных месцаў для насельніцтва.

Таццяна Шымук. Сон у зімовую ноч